# Новы верш земляка

Даведаўся з газет пра тую стыхію, якая пранеслася над Хоцімскам, над усім раёнам. І хоць сам я цяжка хворы, не магу чым-небудзь дапамагчы, але падзяляю з вамі, з вашым болем і свой боль, пачуцці горычы выказваю ў гэтым вершы, які вам пасылаю.

Нізкі вам усім паклон.

**Ваш Пятро ПРЫХОДЗЬКА.**

## МАІМ ЗЕМЛЯКАМ

Над Хоцімскім раёнам і над гарадскім пасёлкам пракацілася віхурная стыхія, у многіх вёсках, на ўскраіне пасёлка сарвала з дамоў стрэхі, паваліла, вырваўшы з карэннямі, дрэвы, разбурыла будынкі, нанесла шкоду раёну больш чым на два мільярды рублёў. На шчасце, людскіх ахвяр не адбылося.

(З газет).

Землякі вы мае!
У кожным вершы я
Чую рук вашых поціскі.
У жыцці песню першую
Я падслухаў у Хоцімску.
Тую песню балескую
Пра сіротку цыганскага
На жыццё ўсё з маленства я
З ручайка ўпітваў наскага.
Быў пачуць яе рады я
З вуснаў цёткі вясковае.
Як з нябёс зорка падае
На галінкі кляновыя...
А сягоння ўстрывожаны
Весткай надта жахліваю,
Што стыхіяй зняможаны
Хаты, дрэвы над нівою.
Над пасёлкам, над полем
Смерч пранёсся
сваволлем.
З вашым горам і болем
Падзяляю свой боль я.
Ды не трэба адчайвацца, —
Лёд стыхіі распарыцца
І над Бесяддзю чаіца
Ўскрыкне светлаю раніцай.
Зазіхцяць пад заранкамі
Травы, росамі ўмытыя.
І не буду ў цыганкі я
Сваю долю выпытваць.
Выбачайце, што ў час такі
Вас наведваю рэдка я.
Але кожная ластаўка,
Кожны кут стане сведкаю,
Што люблю ад калыскі я
Тут мясціны ўсе родныя,
Дзе жывуць мае блізкія
Людзі шчырыя, добрыя,
І хоць сёння не густа мо
Шчодрасць падае жменямі,
Пачастуйце капустаю
І ячменнай крупеняю.
Да вас песняй сардэчнаю
На вятрах буду несціся —
На зямлю сваю вечную,
Па ўсёй роднае Бесядзі.

30 мая 1997 г.

**Прыходзька, П.** Маім землякам : верш / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 1997. — 30 жніўня. — С. 3.